Падтрымай "Вясну" на PATREON

8 студзеня - пачатак новай хвалі судоў над удзельнікамі акцый за незалежнасць (анлайн) фота відэа дапоўнена

08.01.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Акцыя ў Мінску 7 снежня 2019 года.

У Мінску ўзнавіліся суды над удзельнікамі акцый у падтрымку незалежнасці, якія адбыліся 7, 8, 20 і 21 снежня мінулага года. У перыяд з 8 па 10 студзеня ў Мінску і іншых гарадах Беларусі запланавана каля 50 судоў па артыкуле 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах).



Акцыі за незалежнасць Беларусі: афіша судоў на 8-10 студзеня

Каго яшчэ чакаюць суды за снежаньскія антыінтэграцыйныя акцыі? "Вясна" падрыхтавала расклад судоў на 8-10 студзеня.

Каго судзяць 8 студзеня?

Суд Маскоўскага раёна г. Мінска

Алена Талстая: 10:00, ч. 3 арт. 23. 34 КаАП; Суддзя - **Юлія Варакса;** Вынік - **50 базавых велічынь (1350 рублёў).**

Віталь Савіч: 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Лідзія Целіца;** Віталь Савіч на пасяджэнне не прыйшоў. У выніку яго судзілі не толькі за акцыю 7 снежня, але і за 20 і 21 снежня, то бок па трох пратаколах. Вынік **- 25 базавых велічынь (675 рублёў).**

Вячаслаў Касінераў: 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Таццяна Мотыль**. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.

Марына Касінерава: 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Юрый Машкетаў**. На Марыну складзены пратакол за ўдзел у акцыі 20 снежня. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**



Марына і Вячаслаў Касінеравы на судзе 8 студзеня

Сяргей Антончык: 10:00, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Віктар Казак**; Антончык у суд не з'явіўся па сямейных абставінах. Яго судзяць за ўдзел у акцыі 20 снежня. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў).**

Актывіст Legalize Belarus **Міхась Варанцоў:** 11:30 (каб. 135). ч.1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Лідзія Целіца**; Міхась Варанцоў падаў хадайніцтва аб вядзенні працэсу на беларускай мове. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.



Міхась Варанцоў перад судом 8 студзеня

Актывістка "Моладзевага блоку" **Алана Гебрэмарыям:** 11:30 (каб. 135). ч.1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Таццяна Мотыль**. Алана хадайнічала аб азнаямленні з матэрыяламі справы. Суддзя хадайніцтва задавальняе, абвяшчае перапынак. Пасля перапынку актывістка заявіла адвод суддзі, бо не давярае ёй. Адвод адхілены. Перапынак да 15:00, пасля чаго суддзя паведаміла, што справа адпраўлена на дапрацоўку.



Алана Гебрэмарыям у судзе 8 студзеня



Міхась Варанцоў, Алана Гебрэмарыям разам з праваабаронцам "Вясны" Андрэем Палудаў і актывістам Арамаісам Міракянам

Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў **Мікалай Трафімчук**: 11:30, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Юлія Варакса**. Сам Трафімчук на пасяджэнне прыйшоў, аднак сведкі міліцыянты **Суораў і Бахановіч** - не. Трафімчука абвінавачваюць ва удзеле ў акцыі 21 снежня. Вынік - **20 базавых велічынь (540 рублёў)**.



Мікалай Трафімчук

Святар **Леанід Акаловіч:** 11:30, ч. 1 арт. 23.34 КаАП; Суддзя - **Юрый Машкетаў**. Абвінавачваюць ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі 21 снежня. Вынік - **30 базавых велічынь (810 рублёў)**.

Суд Пінскага раёна і г. Пінска

Адбудуцца суды за ўдзел у мясцовай акцыі супраць інтэграцыі з Расіяй, якая адбылася ўвечары 20 снежня ў цэнтры горада.

- **Дзмітрый Тарасюк:** 11:00, арт. 23.34 КаАП; Суд перанесены на 09:15 9 студзеня.
- **Мікалай Міхалевіч:** 11:00, арт. 23.34 КаАП; Атрымаў **10 базавых велічынь (270 рублёў) штрафу**.



Твитнуть







Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY